

# Берасцю – 1000 гадоў

Не так даўно ў Берасці выйшлі два тамы кнігі “Замок Берестейскій”, аўтарства прафесара Анатоля Гладышчука, выкладчыка Дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта ў Брэсце. Першы том прысвечаны перыяду, калі Берасце знаходзілася ў межах рускіх княстваў (X-XIII ст.), а другі перыяду Вялікага Княства Літоўскага да часоў Рэчыпаспалітай (XIV-XVI ст.). На аснове багатага выбару крыніц, з выкарыстаннем вынікаў шматгадовых археалагічных раскопак, аўтар паказвае багатую гісторыю Берасця. Падчас пабудовы ў I палове XIX ст. брэсцкай крэпасці, быў знішчаны ўвесь стары горад. Таму вельмі цяжка цяпер рэканструяваць дакладны яго вобраз. Дапамагаюць старыя гравюры, мапы і інвентар замка, складзены ў 1566 годзе Дзмітрам Сапегай. Выкарыстоўваючы здабыткі тэхнічных навук, Анатоль Гладышчук вельмі пераканаўча лакалізуе гістарычныя аб’екты – царкву св. Пятра, мэнніцу, замкавыя вежы і іншыя.

Сёлета Берасце адзначае 1000 гадоў з часу запісу ягонай назвы на картах летапісаў. Дату 1017 пацвярджаюць адначасова дзве крыніцы – Ноўгародскі летапіс ды нямецкая Хроніка мерзэбургскіх епіскапаў. Хаця афіцыйныя святкаванні 1000-годдзя Берасця запланаваны на 2019 г., але менавіта сёлета адзначаем гэтую вялікую гадавіну.

Пра першую звестку аб Берасці з 1017 г. прафесар Анатоль Гладышчук гаварыў на навуковай канферэнцыі, якая прайшла 22-23 мая г.г., ў рамках “Пролагу” у Бельску Падляшскім. Варта пазнаёміцца з ягонымі разважаннямі на гэтую тэму.

Пытанне аб першай пісьмовай згадцы Берасця пастаўлена не сёння, але напярэдадні святкавання 1000-годдзя горада яно набыло актуальны сэнс. «Калі нарадзіўся Брэст?» – праблема гэтага пытання ў тым, што маючы два погляды на гэтую тэму – 1017 або 1019 год? – самое пытанне грунтоўна нікім і ніколі не даследавалася.

Калі Брэст пачаў святкаваць сваю дату?

Гэта здарылася зусім нечакана і без усялякай дыскусіі на самую тэму. 1 красавіка 1966 года ў Брэсце была адкрыта тэхнічная, вышэйшая адукацыйная ўстанова БІБІ (Брэсцкі інжэнерна-будаўнічы інстытут). Безумоўна ўжо ў 1969 годзе трэба было грунтоўна задумацца, што будуць рабіць будучыя будаўнікі-інжынеры? І тут раптам у абласной газеце «Заря» ад 25 студзеня 1969 года з'яўляецца артыкул «Облик родного города» прафесара **Саркісава М. А.** і дацэнта **Кузняцова В. Д.**, якія працавалі ў інстытуце. Артыкул без усялякіх прадумоў абвяшчаў 950-годдзе Брэста і голасна прызываў: *«Таму Брэст патрэбна будаваць, будаваць і будаваць…»ю* Гучны прызыў падтрымалі рэспубліканскія і саюзныя СМІ. 24 мая 1969 года на плошчы Леніна адбыўся мітынг у гонар 950-годдзя Брэста, потым тэатралізаванае відовішча і завяршылася ўсё ўрачыстым паседжаннем у тэатры. Так Брэст атрымаў сваю дату. Заўважым, святкаванне 950-годзя Брэста вельмі ўдала зыйшлося з адкрыццём летапіс-нага Берасця летам таго ж года беларускім археолагам **П. Ф. Лысенка**. Нічога дрэннага ў гэтым няма, але існавала і існуе гістарычная навука, у якой ёсць свае патрабаванні да прызнання дат – гэта ў першую чаргу пісьмовыя гістарычныя крыніцы.

Калі пісьмовыя хронікі Русі

*Берасце ў 1657 г. на гравюры Э. Дальберга*

*Драўляныя пабудовы старажытнага Берасця XI-XIII ст.*

ўпершыню ўзгадваюць аб Берасці?

Сінадальны харатэйны спісак Ноўгарадскага летапісу старшага ізвода, стварэнне першай часткі якога даследчыкі адносяць да XIII ст., паведамляе: «Въ лѣто 6525 [1017] Ярославъ иде къ Берестию и заложена бысть святая София Кыевѣ». Штосьне дамаўляе летапіс манаха Лаўрэнція «Повесть временных лет», створаны ў 1377 годзе: *«В лѣто 6525 [1017]. Ярославъ иде и погорѣ церкви»*. Пазнейшыя летапісныя спіскі Русі, заўважым, не канфліктуюць з папярэднімі:

– *Въ лѣто 6525 [1017], Ярославъ иде къ Берестию; и заложена бысть святыя Софѣя в Кыевѣ* [Ноўгарадскі першы летапіс маладшага ізвода];

– *Ярославъ, побѣдивъ Святополка, внійде въ Кіевъ и сѣде на престолѣ отчемъ, имый тогда лѣтъ 28; и пріяша его Кіяне со радостію, въ лѣто 6525 (1017). Въ се же лѣто погорѣша церкви въ Кіевѣ* [Гусцінскі летапіс];

– *Въ лѣто 6525 [1017]. Заложи Ярославъ градъ великій Кіевъ, и златыя врата постави, и церковь святыа Софіа заложи* [Ноўгарадскі другі летапіс];

– *Въ лѣто 6525 [1017]. Пріидоша Печенѣги ко граду Кіеву, и бысть подъ градомъ сѣча зла, и едва Ярославъ Владимировичь къ вечеру одолѣ Печенѣгов, и отбѣгоша посрамлены. Того же лѣта заложи Ярославъ градъ Кіевъ, и Златая врата постави, и церковь святыя Софіи заложи* [Ноўгарадскі трэці летапіс].

Але ўсе вышэйзгаданыя крыніцы былі створаны значна пазней самой падзеі – першай пісьмовай звесткі аб Берасці ў 1017 годзе. Гэта хутчэй за ўсё і дазволіла маніпуляваць датамі 1017 або 1019 год, не паглыбляючыся ў больш аргументаваныя довады.

Хроніка мерзэбургскіх епіскапаў або хроніка Тітмара (Дітмара) захавалася ў арыгінале. Сёмую кнігу хронікі Тітмар завяршыў пісаць за два месяцы да сваёй смерці (памёр 1 снежаня 1018 года). І там знаходзім адназначнае падцверджанне існавання царквы Святой Сафіі ў Кіеве ў 1018 годзе: *«VII, 65: ... [1018] ... Архиепископ того города почтил прибывших в храме Св. Софии, который в прошлом году сгорел по причине несчастного случая... »*. Гэта вельмі цвёрды аргумент існавання Св. Сафіі ў Кіеве ў 1017 годзе, які адзначыў равеснік гэтай падзеі Тітмар, не маючы ніякага зацікаўленага погляду на апісанне самой падзеі.



Але будаўніцтва царквы Св. Сафіі ў Кіеве і паход Яраслава да Берасця знаходзяцца на адной летапіснай паліцы 1017 года ў самым старажытным з захаваўшыхся летапісных спіскаў Русі, які складалі на аснове яшчэ больш старажытных крыніц.

Трэба заўважыць, што на Бузе ў 1017 годзе існавала толькі два рускіх горады. Першым была Валыня, аб якім Тітмар напіша ў сваёй хроніцы аб падзеі 1018 года, калі польскі князь разбіў войска Яраслава. Другім горадам было Берасце, аб назве якога Тітмар меў не зусім верагодна, дасканалае разуменне, таму і напісаў хутчэй за ўсё *«овладев[неким]городом, ничего[более]там не добился»*, маючы на ўвазе князя Яраслава. Гэта дае аснову гісторыку А. В. Назаранка заключыць: «В таком случае, коль скоро в правильности «новгородской» хронологии относительно похода Ярослава к Берестью усомниться мы не вправе, а относительно построения киевской Софии обязаны допустить ее возможность, то есть ли причина отрицать, что и нападение печенегов также действительно состоялось в 1017 г.? Таких причин мы не видим.

Итак, с большой степенью вероятности можно полагать, что пожар в Киеве и печенежские наезды, описанные у Титмара в главе VIII, 32 сразу же после интересующего нас сообщения о захвате Ярославом какого-то города Святополка, имели место летом–осенью 1017 г., когда Ярослав был занят военными действиями под Берестьем.

Но тогда возникает естественное впечатление, что все анахронизмы в начале главы VIII, 32 возникли в результате припоминания об одновременных событиях, иными словами, что взятие города, о котором говорится здесь, – это захват Ярославом Берестья в 1017 г., уже описанный в свое время в главе VII, 65

по сведениям из совсем другого источника. Последовательность, в какой эти три эпизода (поход Ярослава на Берестье, набег печенегов на Киев, пожар в столице) приведены информантом Титмара, участником киевского похода 1018 г., и записаны в „Хронике“, соответствовала бы,



таким образом, реальной последовательности событий. Осведомитель мерзебургского епископа его „Хроники“, разумеется, не читал и не мог указать ему на тождественность происшествий, изложенных в главах VII, 65 и VIII, 32; у самого же Титмара не было никакого повода для такого отождествления».

Паведамленні ў захаваных спісках летапісаў Русі і арыгінал Хронікі мерзебургскіх епіскапаў, як і аргументы прафесара Назаранка, даюць важкую аснову для лагічнага заключэння: *«Яраслаў Уладзіміравіч у 1017 годзе сапраўды да Берасця хадзіў і завалодаў горадам Святаполка Ўладзіміравіча»*.

Калі гэта так, то першае летапіснае згадванне Берасця адносіцца да 1017 года, тады БЕРАСЦЮ споўнілася 1000 гадоў!!!

**Анатоль Гладышчук**
(г. Берасце)
апрацаваў **Дарафей Фіонік**

# Раман

Не трэ было Раману, дзякуй Богу, ніколі па судах цягацца. Не спатрэбілася. І не судзіўся, і як сведак не ставаў, ні ў справах уласных, ні ў чужых. Калі раз трэба было ў суд ехаць на зацвярджэнне тастамента па бяздзетным браце, сваю спадчыну пісьмова пераказаў іншаму сваяку-сіраце; вядома, паперка была пацверджаная, а сам Раман, на ўсякі выпадак, “захварэў”. Бо чаго валачыцца ў Беласток, плаціць грошы за дарогу, час, прызначаны на гаспадарку, траціць! Бачылі вы такое!

Хто любіць таўчыся па свеце, а хто і не вельмі. Хопіць Раману штосераду завезці свае прадукты на рынак у гміннае мястэчка. У Беласток, да дзяцей ды ўнукаў, Раман ужо толькі жонку высылае. Хай нават і пару дзён пасядзіць яна там, а яму тут, у хаце, спакайней. Без бабы справіцца: электрычнасць у хаце і хлявах, не трэба статак кароў два разы ў дзень тузаць за вымя. Уключыў — і пайшло; іншая спрва, ці карове прыемна. Усё дзівуюцца Раману: нашто яму столькі ўсяго, тая гаспадарка на старасць, калі б мог ужо здаць усё “пад панства”. А то капусты насадзіць столькі, што ўся вёска менш яе мае, то бульбы, пшаніцы, то жывіны столькі... А набірае зямлі яшчэ больш, бярэ суседскую ў арэнду, аблагі заворвае... Ну, весь век добры гаспадар быў. Без зямлі жыць не можа, рукі склаўшы. І цяпер, хоць усе аднагодкі — ужо пенсіянеры, Раман калупаецца ў зямлі, сее, збірае, гадуе. Таўчэцца. Чалавек добры, з суседзьмі добра жыве. І добра было б, каб так і да канца...

Ці прадаў Раман Верцы капусту? Ці, можа, яна накрала яе ў яго? Калі б нават украла, то, пэўна, не заўважыў бы, а калі і нават прыкмеціў, то не пашкадаваў бы тых пару галовак. Хай нарыць, наесца. Муж яе пакінуў, жыве адна, зусім апусцілася. Здаецца, штось у яе не так і з галавою ад тае самоты. Шкада старое. Прывалачэцца ў тваюхату, сядзе, транты раскіне, то злосць бярэ, што нічога не робіць — пайшла б дадому, ушчувае суседку Раман, але брыды ж не робіць. Была з яе добрая гаспадыня калісьці. Што ж зробіш, жыццё кабеце не ўдалося. І цяпер яшчэ гаспадыня з яе, на яе зямля пішацца...

Ці то хтось параіў Верцы, ці не сам Раман падказаў, каб тое зямлі пазбылася. Значыць, не ў арэнду давала, а прадала. За тыя грошы дажыве ці тутака, ці ў Дому старцаў. Дзяцей не мае, то хто ж яе дагледзіць. А і зямля тут падаражэла, народ мястовы купляе яе на дачы.

І тут раптам аб’явіўся Верчын муж, што дух ягоны быў ужо прастыў у ваколіцы. Падаў на жонку ў суд, што ненармальная, каб правы адабраць. Што ў грашах яна не разбіраецца, што ходзіць бы блудная па сяле, што вось у Рамана накрала капусты... Шкодная, значыцца, для грамадства, зачыніць яе трэба ў псіхушцы, а маёнтак перадаць мужу, каб распараджаўся. Разводу ў іх жа ж няма. Адваката нават Антон наняў.

— Рамане, я ж у цябе нічога не крала... Не? Паедзь у той суд, скажы, як то было, — узмалілася Верка.

Яна не думала пра сапраўдныя матывы дзеянняў мужа, забалела ёй толькі тое, што робіць з яе зладзейку. Яшчэ каб пэгеэрскае брала, але гаспадарскае?!

Паехаў Раман у Беласток, пасведчыць. Сказаў, што трэба: не крала суседка ў яго капусты. Гаварыў, а глядзеў усім у вочы — і суддзі, і адвакату, і Верцы, і былому суседу Антону... Каб нікому не зашкодзіць, каб ніхто не пакрыўдзіўся... Каб добра было.

Ехаў увесь мокры дахаты.

**Міра Лукша**